2024 - № 2 (20)

# БЕЛАРУСКІ НАСТАЎНІК

# Беларускі

настаўнік

„Беларускі настаўнік” гэта адукацыйны дапаможнік перш-наперш настаўнікам беларускай мовы ў польскіх школах. Але не толькі. Хочам, каб наш часопіс дапамагаў усім зацікаўленым беларускай адукацыяй, напрыклад, гісторыкам і географам, якія ўводзяць на ўроках элементы навучання гісторыі і геаграфіі Беларусі, але таксама Падляшша. Каб пашыраў сярод настаўнікаў веды пра Беларусь і азнаямляў з новымі метадамі навучання. Хочам, каб гэта была таксама настаўніцкая платформа абмену меркаваннямі, праблемамі, досведам.

Часопіс задуманы Аб'яднаннем у карысць дзяцей і моладзі, якія вывучаюць беларускую мову АБ-БА. Яго ідэя ўзнікла ў час працы над „Стратэгіяй развіцця асветы беларускай нацыянальнай меншасці ў Польшчы”.

„Беларускі настаўнік” выходзіць раз на паўгода. Запрашаем да супрацоўніцтва. Калі маеце цікавыя сцэнарыі ўрокаў або пазаўрочных заняткаў, урачыстых лінеек, школьных мерапрыемстваў, экскурсій, тэатральных спектакляў, калі ў Вас ёсць цікавыя гульні і дыдактычныя матэрыялы, прапануйце іх, з дапамогай нашага часопіса, іншым. Калі ў Вас узніклі пытанні, звязаныя з навучаннем беларускай мове, пішыце.

Матэрыялы і пытанні дасылайце на наш электронны адрас **ab_ba@poczta.onet.eu**. Часопіс „Беларускі настаўнік” даступны ў Вашых школах і на нашым сайце **www.ab-ba.com.pl**.

# Ад рэдактара

Калі чытаю сцэнарыі заняткаў з вучнямі дасведчанай педагожкі Тамары Мацкевіч, лепш разумею мае траўмы з дзяцінства, звязаныя са школай. Малады чалавек у той час заўсёды адчуваў сябе вінаватым: чагосьці не вывучыў, не прачытаў, не напісаў, не зрабіў. Адным словам — не выканаў загад настаўніка. Як я хацеў бы вярнуцца ў мае юначыя гады і хадзіць у школу, дзе б мог нешта сказаць ад сябе, дзе настаўнікі падыходзілі б да вучня па-партнёрску. Тады ўрокі атрымаліся б не толькі цікавейшымі, але і, я ўпэўнены, далі б большы плён нам на парозе дарослага жыцця. Вучні актыўныя і крэатыўныя, — пераконвае Тамара Мацкевіч. Не так і важна, ці ствараеш з імі генеалагічнае дрэва іх сем'яў, ці распісваеш план на тое, каб зарабіць вялікія грошы. Трэба толькі дазволіць ім праявіць сябе. Зразумела, у пэўных межах, якія павінны быць супольна вызначаны.

«Трэба спачатку выслухаць дзіця, — кажа настаўніца-пенсіянерка Вера Краўчук, — і толькі потым нешта раіць ці спрабаваць развязаць праблему». Рэкамендую пачытаць інтэрв'ю са спадарыняй Верай не толькі таму, што гэта мая настаўніца беларускай мовы ў пачатковай школе, але перш-наперш таму, што адным яно прыпомніць важны для нашага грамадскага авансу і ўжо забыты час, а другім адкрые вочы на мінулае беларускай вёскі на Падляшшы.

Пра мінулае, але ўсё яшчэ свежае, таксама кніжка Міхала Андрасюка *Żubr i inne opowiadania* ў перакладзе на польскую мову Марціна Рэмбача. Варта яе прачытаць самому, можна таксама падумаць пра тое, як яе выкарыстаць у працы з вучнямі. Гэта не толькі цэлы космас чалавечых перажыванняў, але і апісанне мястэчка ў канкрэтным месцы і часе.

Сёння наогул няма праблем з доступам да інфармацыі. Хутчэй ёсць з яе селекцыяй, з адсейваннем зерня ад паловы. З нутра інтэрнэту выцягнулі мы некалькі, на нашу думку вартасных, адукацыйных прапаноў Фонду «Тутака». Спадзяюся, што яны вам таксама прыйдуцца даспадобы. Як і «Беларускі настаўнік».

**Мікола ВАЎРАНЮК**

# Настаўніца роднай мовы



Мікола ВАЎРАНЮК



Сваю настаўніцу беларускай мовы ў Пачатковай школе ў Кленіках сустрэў я выпадкова. Штосьці трэба было мне аформіць у геадэзіста ў Бельску. Калі ўжо знайшоў патрэбны адрас і накіраваўся ў офіс, з суседняга пад'езда выйшла стройная, высокая жанчына. Гады яе зусім не пахілілі, толькі бездакорна — як заўсёды — звязаныя ў куклу валасы пасівелі. Не магло быць памылкі, хаця мы не бачылі адно аднаго сама менш гадоў сорак. Здавалася, што **Вера Краўчук** (1936 года нараджэння) не ідзе па бельскім тратуары, а па школьным калідоры, з класным журналам пад рукой. І зараз не спытае мяне пра жыццё, сям'ю, працу, а папросіць спыніць гонкі на лесвіцы ды ісці пад клас, бо ўжо заканчваецца перапынак. Пані Вера заўсёды, не толькі на ўроках, гаварыла па-беларуску.

**— На скрыжаванні кленіцкай вуліцы з дарогамі ў Чыжы і Гародчына, каля каплічкі стаіць помнік савецкім салдатам, якія загінулі ў наваколлі ў 1944 годзе. Не ведаю, ці на Беласточчыне ёсць другі такі. Надпіс на**




**ім па-беларуску. Гэта Вашая работа? — пытаюся, калі праз пару месяцаў наведваю настаўніцу ў яе ўтульнай кватэры.**

— Гэта была ініцыятыва бацюшкі Аляксандра Высоцкага. Ён папрасіў мяне зрабіць надпіс па-беларуску. Слушна. Як жа інакш магло быць у беларускай вёсцы?

**— Праўда, у 1981 годзе гэта было зусім натуральна. Я якраз тады закончыў школу ў Кленіках і нікому — ні вучням, ні бацькам — у галаву не прыходзіла, што можна не вучыцца беларускай мове. А нас жа было многа, калі дайшлі вучні з Тыневічаў і Гародчына, былі па два паралельныя класы.**

— А ўжо колькі гадоў няма школы. Праўда, я раней паспела выйсці на пенсію. Усё жыццё там прапрацавала.

**— Усё жыццё ў адным месцы?**

— Так. Як пачала ў дзевятнаццаць гадоў, то аж да апошняга званка. У міжчасе год ці два ездзіла з Кленік у Гародчына, бо не было каму там вучыць беларускай мове.

**— Як Вы трапілі ў Кленікі?**





Вера з бацькамі Мікалаем і Еўдакіяй і старэйшай сястрой Маняй.

Калі я заканчвала Педагагічны ліцэй у Бельску, настаўнік Фёдар Скок, які мяне любіў, прапанаваў, каб я працягвала навуку ў Савецкім Саюзе. Мама кажа: «Так далёка? Будзем сустракацца раз у год?». Не пусцілі мяне. Тады было размеркаванне на працу. Мяне хацелі паслаць у нейкую вёску на Сакольшчыну, на самой дзяржаўнай мяжы. Бачыш, не магу ўспомніць яе назвы, бо бяру цяпер лякарства, якое адмоўна ўплывае на памяць. Ну, няважна. Мне вельмі не хацелася туды, бо далёка і з даездам былі вялікія праблемы. Скок кажа: «Ладна, нешта прыдумаем». І аказалася, што магу выбраць школу бліжэй, або Арэшкава ў Белавежскай пушчы, або Кленікі. Калі мама пачула пра Кленікі, усцешылася, што буду ў сваім прыходзе!

**— То Вы з Кленіцкага прыхода? А з якой вёскі?**

— Мы жылі на калёніі вёскі Ступнікі, але найбліжэй было нам да Зубава.

**— Як Вас — такую маладую — прынялі на месцы?**

— Тады ўсе настаўнікі былі маладыя. Заканчвалі сярэднюю школу і ішлі працаваць.

**— Вы ў Кленіках не толькі атрымалі працу, але і знайшлі сваю другую палавінку. Дарэчы, мой тата да канца жыцця быў пераканаты, што найлепшы лекар — Краўчук у Кленіках.**



Вучаніца Педагагічнага ліцэя ў Бельску.



Сёстры
Маня і Вера.

— Генэк, па-першае, нікому не адмаўляў у дапамозе. Ездзіў па вёсках ды навакольных хутарах і днём, і ноччу. Па-другое, у яго была нейкая такая інтуіцыя. Памятаю як аднаго хлопца ў Козліках моцна ўдарыла токам. Генэк вызваў хуткую і загадаў ім весці яго адразу ў Беласток. *„Trupów nie wozimy”,* — адказаў ці то лекар, ці санітар. Мой муж наогул быў вельмі спакойны, такі нават флегматычны, а тут як чорт у яго ўступіў! «Будзеце мець жыццё чалавека на сумленні! Я таго так не пакіну!». Яны, калі ўбачылі такую фурыю, завезлі таго хлопца ў Беласток і там яго адратавалі. Потым пры сустрэчы ён казаў: «У мяне цяпер двух бацькоў — адзін родны, а другі Вы, пан доктар, бо дзякуючы Вам я жыву».



Уладзімір Федарук,
брат таты.

**— Вы абое былі ў Кленіках прыезджыя. Памятаю, што жылі ў службовай кватэры ў старой школе.**

— Гэта ўжо было пазней. Раней наймалі такую малую хатку насупраць крамы. Там не было дзе павярнуцца. Наш сын Славік навучыўся хадзіць не на падлозе, а на канапе. Ну што ж, так жыла тады вясковая інтэлігенцыя, якую кінулі павышаць узровень жыцця сялян. Мяне, праўда, у суседнюю вёску, а мой муж быў аж з Баратынца-Рускага каля Сямятыч.

**— Не думалі перабрацца ў горад?**

— Не было калі думаць. Праца патрабавала многа часу, павышэння кваліфікацый, сям’я, дзеці. Калі яны падраслі, то сталі абое студэнтамі — тады пагатоў не было што думаць пра гарадскую кватэру, бо ж утрыманне дзяцей каштавала нямала. Толькі калі муж цяжка захварэў і пасля аперацыі не мог хадзіць, мы купілі кватэру ў Бельску, каб быць блізка дачкі Галіны. Яна разам з мужам Юркам дапамагалі мне яго глядзець.

**— Як Вы сталі настаўніцай?**

— Татаў брат Уладзімір да вайны быў настаўнікам і нават куратарам асветы ў Гродне. Яго за тое саветы вывезлі ў Сібір. Пасля вайны вярнуўся ў Польшчу і стаў жыць у Шчэцінку. Я яго бачыла адзін раз у жыцці, калі пераязджаў



Першыя гады ў Кленіках з калегамі настаўнікамі.

з Савецкага Саюза на *Ziemie Odzyskane*. Тым не менш часта пра яго гаварылі ў сям'і, ён быў такім аўтарытэтам. Відаць, таму і я з дзяцінства марыла стаць настаўніцай. І любіла вучыцца, хоць не было лёгка. З нашага хутара трэба было хадзіць у школу ў Зубаве, а потым яшчэ далей — у Пасынкі, дзе я вучылася ад пятага да сёмага класа. Восенню і вясной мясілі мы балота па дарозе з пазнейшым дырэктарам Беларускага ліцэя ў Бельску Аляксеем Карпюком, які жыў непадалёк нас, у пачатку Зубава. А ў Педагагічным ліцэі ў Бельску я вучылася з Оляй Ігнацюк, якая стане маёй сванькай, Віктарам Кабацам, Галенай Тапалянскай, якая пасялілася і працавала ў Трасцянцы ці тваім цесцем Сцяпанам Бурылам.

**— Цесць, бывала, расказваў вясёлыя гісторыі з інтэрната. Вы таксама там жылі?**

— Не, я жыла ўсе чатыры гады на адной кватэры. Палічылі мяне дачкой багатага гаспадара, паўгектара зямлі не хапала да поўнага кулака, і мне не прызначылі месца ў інтэрнаце. Во тут відаць, якая я была багатая, — пані Вера паказвае мне здымак з сяброўкай, якая падаецца мне знаёмай. — Гэта Марыся з Райска (ясна, гэта ж шматгадовая машыністка «Нівы» Марыя Федарук, якая адна магла расчытаць рукапісныя вершы Алеся Барскага), якая фарсіць са скураной сумачкай. А як думаеш, з чаго мая зробленая?



З сяброўкай Марысяй з Райска ў Бельску ў час вучобы ў ліцэі.



З мужам Яўгенам.

**— Па-мойму таксама са скуры.**

— А дзе там (*смех*)! Мая — кардонная, толькі аклееная пераплётнай паперай, каб была падобнай на скураную. Сама яе пашыла, з дапамогай таты. Што тут казаць, мы ўсе тады былі бедныя, але неяк правучыліся і сталі настаўнікамі.



Дзеці Галіна і Славік.

**— У Вашым выпадку гэта быў вельмі добры выбар. Вучні Вас любілі.**

— Не ведаю, ці ўсе і заўсёды (*смех*). Вучні малодшых класаў любілі, як я ім чытала казкі. Калісьці ў чацвёртым класе на ўроку не скончыла, то прасілі, каб на перапынку таксама ім чытаць. Ага, а прыбіральню прынясем у клас? А ў пятым чытала нешта пра вайну, то дзеці пачалі плакаць. Выходзім на перапынак, дзяўчаты яшчэ заплаканыя, а тут ідзе дырэктар Мікалай Міхалюк: *„Co się tu dzieje?”* — *„Panie dyrektorze, to Pani nam tak czytała”.* — *„A, jak Pani czytała, to w porządku”.*

Малыя дзеці хацелі хадзіць за руку. Калісьці дзве першакласніцы пасварыліся за гэта, а я ім кажу: «У мяне дзве рукі». Я журнал узяла пад паху і так ішлі, трымаючыся за рукі па калідоры.

Я заўсёды ставілася да дзяцей з увагай. Старалася выслухаць, што іх турбуе, што перажываюць, а потым нешта параіць. Дарослыя часта забываюць, што самі таксама былі дзецьмі, замала ў іх цярпімасці.

**— Дзе Вы гэтаму вучыліся?**

— Мне здаецца, што вынесла з хаты. Мама пражыла жыццё і ні з кім з суседзяў не пасварылася. Тата таксама памагаў усім навокал. І ўсё ўмеў рабіць сваімі рукамі. Швейную машыну купіў і навучыўся шыць. То ён мне разрысаваў тую сумачку. Валёнкі рабіў. Калі каго адсылаў да суседа Пеці Лапінскага, то казалі: «Нам трэба такія ў царкву, а Пеця робіць валёнкі на штодзень». Дрэвы ў садзе ўмеў прышчапіць. Труны рабіў суседзям задарма. І выконваў ролю ветэрынара: дапамагаў, калі каровы цяліліся. Раз нават, калі суседава карова аб'елася маладой канюшыны і яе здула, то ножыкам празэзаў у баку дзірку і спусціў паветра. Не ведаю, дзе ён гэтаму навучыўся.

**— Бацькам важна было, каб Вы вучыліся? Якая ў іх была адукацыя?**

— Мама не хадзіла ў ніякую школу. Паехала ў бежанства, а калі вярнулася, была бяда, так што не да школы было. Тата закончыў чатыры класы рускай школы. У яго была фенаменальная памяць — прачытае кнігу і праз дзесяць гадоў помніць, што там было напісана. Пушкіна нам услых чытаў у арыгінале і багагласнік на старацаркоўнаславянскай мове мог чытаць, але па-польску чытаць і пісаць вучыўся ўжо разам са мною.

А як ставіліся да адукацыі дзяцей? Больш-менш так як тады ўсе вяскоўцы. Найважнейшая была гаспадарка. Мая старэйшая сястра (1932 года нараджэння) сядзела за адной партай з дачкой кіраўніка школы ў Зубаве Нестара Перавоя. Той намаўляў бацькоў, каб паслалі яе ў сярэднюю школу, бо вельмі здольная, але дзе там, патрэбныя былі рукі да працы, а потым выйшла замуж. Я магла вучыцца, бо на гаспадарцы заставаўся малодшы брат. Аднак ён потым ажаніўся з настаўніцай і пераехаў жыць у Бельск. Як бацькам было цяжка глядзець на тое, што няма каму пасля іх займацца гаспадаркай. Плакалі.

**— Вы сталі працаваць адразу пасля ліцэя. Якім прадметам вучылі?**

— Усім. У малодшых класах комплексна, а ў старэйшых даводзілася і геаграфіі, і біялогіі, і гісторыі, і пластычным заняткам.

**— Потым прыйшлося паглыбляць веды, павышаць кваліфікацыі. Вы вырашылі завочна штудзіраваць беларускую філалогію ў Варшаўскім універсітэце.**

— Беларускую і рускую. Дыпломную працу пісала ў прафесара Аляксандра Баршчэўскага. Гэта была «Абраднасць, звычаёвасць і фальклор вёскі Кленікі». Вось яна, паглядзі.

**— Тут шмат песень, казак, легендаў, прымавак, прыказак, загадак. Як Вы іх запісвалі? У Вас быў магнітафон?**



З вучнямі Пачатковай школы ў Кленіках.



З вучнямі
і настаўнікамі
ў Кленіках.



З класам і настаўніцай
польскай мовы
Нінай Кобац.



Са сваім класам.



Перад новым будынкам Пачатковай школы ў Кленіках.



З вучнямі і настаўніцай беларускай мовы Марыляй Базылюк.

— А дзе там? Карысталася толькі паперай і алоўкам. Усё запісвала на паперу. Цікава, што такое ж пытанне задалі мне і на экзамене. Я паказала ім на кішэні: усе, якія толькі былі ў адзенні, былі забіты картачкамі. Рассмяяліся. Так то можна было назбіраць столькі матэрыялу.

**— Я вучыўся ў Кленіках напрыканцы 1970-х гадоў. Калі пайшоў у ліцэй, — польскі ў Гайнаўцы, які на той час лічыўся больш прэстыжным, паколькі вучыліся там дзеці мясцовай інтэлігенцыі, лекараў, гарадской і павятовай партыйнай вярхушкі, — не меў ніякіх комплексаў у адносінах да маіх гарадскіх калег. Кленіцкая школа дала мне добрыя веды. Мусіць усе настаўнікі тады ўжо былі з вышэйшай адукацыяй. Да сёння памятаю іх прозвішчы: Ніна Кобац вучыла польскай мове, Надзея Карчэўская матэматыцы, Генрыка Пракапюк біялогіі і хіміі...**

— Геня якраз не мела вышэйшай адукацыі.

**— Што Вы кажаце? Яна была выдатнай настаўніцай. Я ніколі не любіў біялогіі, але яе ўрокі былі цікавымі. А ў прадметным конкурсе па хіміі я дайшоў да ваяводскага этапу і дзякуючы гэтаму мог паступіць у сярэднюю школу без экзамену. А мой сябра Алік Максімюк стаў лаўрэатам гэтага конкурсу.**

— Васіль Пучко добра вучыў фізіцы...

**— ... але яго ўсе баяліся. Ну, можа так будаваў свой аўтарытэт, ён жа быў дырэктарам. І з вучнёўскай перспектывы быў вельмі вялікім мажным мужчынам. Лавіў тых, хто бегаў па калідоры і ставіў барадой да сцяны. І так трэба было стаяць некалькі перапынкаў.**



З мужам, дачкой
і ўнучкамі Касяй
і Натальккай.



Сын і нявестка
ў ЗША.



З мужам Яўгенам.

— Ён насамрэч быў добрым педагогам, заўсёды заступаўся і за вучняў, і за настаўнікаў. І дбайным дырэктарам. А яго жонка вучыла ў малодшых класах.

**— Мяне не, бо ж я першыя чатыры гады адвучыўся ў Тыневічах. Два першыя класы ў звычайных вясковых хатах і два ў гэтак званай «вялікай школе» — драўляным, яшчэ даваенным будынку, дзе раней, калі ў нас была поўная васьмігадовая школа, была і канцылярыя, і кватэра кіраўніка. Пераезд у мураваную школу, дзе было некалькі соцень вучняў павінен стаць цывілізацыйным шокам. Не стаў. Дзякуючы настаўнікам, сярод якіх Вы былі адной з улюбёных.**

— Дзякуй. Працавала як магла і як умела. Старалася. Відаць, штосьці з маёй працы засталося, бо часта падыходзяць да мяне незнаёмыя ўжо людзі і кажуць, што тады і тады былі маімі вучнямі, дзякуюць. Дачка Галіна неяк была сказала: «З табою, мама, не можна ў святочны дзень паехаць на могілкі ў Кленіках , — я казала, што гэта наш прыход і там пахаваныя нашы сямейнікі, — бо пакуль дабярэмся да магіл нашых блізкіх, то праходзіць


ВАРШАЎСКІ УНІВЕРСІТЭТ
Інстытут русістыкі
КАФЕДРА БЕЛАРУСКАЙ ФІЛАЛОГІІ

АБРАДНАСЦЬ , ЗВЫЧАЁВАСЦЬ
І ФАЛЬКЛОР ВЁСКІ КЛЕЙНІКІ

Вера Краўчук
Магістэрская дысертацыя
напісаная пад навуковым
кірункам
др. А.Баршчэўскага

ВАРШАВА 1978 год

Магістэрская праца, абароненая на пяцёрку.

гадзіна, дзве. Столькі людзей хоча з табою пагаварыць».

**— Я таксама цешуся, што нам удалося спаткацца і пагаварыць. Дзякуй за размову і за тое, як Вы прывівалі любоў да роднага слова. Без гэтага, можа быць, беларуская мова не была б так важнай у маім жыцці.**

— Мае вучні ў сшытках, на першай старонцы, заўсёды пісалі «Родная мова як маці, яе нельга ніколі забыць». І гэты дэвіз быў найважнейшы ў маёй працы.

**Размаўляў Мікола ВАЎРАНЮК**



\- 88 -

Калядныя песні

По прызбоньці , по золотэнькуй, коляда
Шчэй по століку, по тісовому, коляда
Шчэй по обрусу покружастому, коляда
Рада Манечка , што /сынка,дочку/ імя уповіла.
А ўповіўшы,урадовалася, коляда
Поехаў мілы на полёване, коляда
Заполёваў тры огороды, коляда
У перщум городі:жыто,пшэніця, коледа
У другум городі:вішні,чэрэшні,коляда
Жыто,пшэніцю самі выжнэмо, коляда
Грушкі,яблушкі самі шчыкнэма, коляда.
/Сынка,дочку,імя/ выгодуемо, коляда
Старым людям на послужэнькі , коляда
А нам молодым на потешэньку, коляда.

x x x

Ой вэсна,красна ў лузі каліна
Ой дай Божэ ў лузі каліна.
Шчэй найкраснейша Коліна жэна
Ой дай Божэ, Коліна жэна.
По дворэ ходіт, як месэць сходіт
Ой дай Божэ , як месэць сходіт.
До сені вуйшла, як зора зышла
Ой дай Божэ , як зора зышла.
До хаты вуйшла панічэ сідят
Ой дай Божэ панічэ сідят.
Панічэ сідят, шляпонькі дэржат
Ой дай Божэ , шляпонькі дэржат.
Шляпонькі дэржат попуд ручкамі
Ой дай Божэ попуд ручкамі .

# Час надзеі і расчараванняў[1]

## *(у мастацкай літаратуры)*



Мікола ВАЎРАНЮК

На пачатак пару слоў ад перакладчыка, якія ўбачым на апошняй старонцы вокладкі кнігі: *Dziesięć opowiadań Michała Androsiuka jak dziesięć listów z przeszłości, które autor napisał, zaadresował, zalegalizował znaczkiem i gorliwie wrzucił do skrzynki. Ale te zostały odłożone w niewłaściwe miejsce przez stażystę zakochanego w konduktorce pociągu, którym jeździł do pracy i zapodziały się na dziesięciolecia. Dziś jako kierownik, przygotowując placówkę do likwidacji, natknął się na nie i przypomniał sobie ów dzień sprzed ćwierćwiecza, kiedy młodziutka konduktorka, obecnie jego żona, odwzajemniła mu uśmiech. Być może właśnie to wspomnienie sprawiło, że odnalezione listy skierował do adresatów, i to w priorytetowym trybie*.

— Міхал хацеў падкрэсліць, што ад моманту напісання гэтых тэкстаў прайшло сама менш чвэрць стагоддзя, — кажа Марцін Рэмбач. — Гэта права аўтара, які не стаіць у месцы, увесь час піша, развіваецца, мяняецца. І я, карыстаючыся персонамі і кодамі з розных яго твораў, пастараўся вобразна растлумачыць гэта чытачу.




[1] Michał Androsiuk, *Żubr i inne opowiadania*; przekład z języka białoruskiego Marcin Rębacz; Centrum Kultury Białoruskiej, Białystok 2024.



Фота Паўла Грэся

— Апавяданні для перакладу выбраў я, — кажа Міхал Андрасюк, — з двух маіх першых кніжак «Фірма» і «Мясцовая гравітацыя». Мне было цікава, як яны будуць успрымацца сёння, калі памяняўся свет вакол нас, калі змянілася Мястэчка, бадай галоўны герой усіх гэтых твораў.

Мястэчка — гэта Гайнаўка. Хаця аўтар не часта ўжывае ўласную назву горада, то чытачы, якія ведаюць гайнаўскую тапаграфію, лёгка пазнаюць сцежкі герояў кніжкі, як і месцы, дзе адбываюцца падзеі. Часам, праўда, такое адно літаратурнае месца збудаванае з трох рэальных, як «Бар у Алеся», на вобраз якога запрацавалі тры падобныя забягалаўкі: «У Валодзі», бар каля Раманюка і «мардоўня» на Хімічнай (след адзначыць, што дзве апошнія назвы — звычаёвыя; час сцёр не толькі гэтыя ўстановы з карты горада, але і памяць пра іх фактычныя шыльды). А часам рэальнае плаўна пераходзіць ва ўяўнае, як веснавая Юдзянка з леташняй травой на запушчаных загонах, на якіх памаленьку выраслі новыя дамы, над якой лётаў Колька, спрытна абмінаючы купалы новаўзведзенай царквы.

У Мястэчку Міхала Андрасюка важная не толькі геаграфія, але і гісторыя. Яно



Фота Паўла Грэся

**Міхал Андрасюк** (1959 г. нар.) — аўтар кніг прозы „Фірма" (Беласток, 2000), „Мясцовая гравітацыя" (Беласток, 2004), „Белы конь" (Беласток, 2006, пераклад на польскую мову — Беласток 2011), „Вуліца добрай надзеі" (Мінск, 2010), „Wagon drugiej klasy" (Беласток, 2010), „Krzyżyk" (Беласток, 2015), „Поўня" (Беласток, 2018).

Узнагароджаны „Залатым апострафам" часопіса „Дзеяслоў" за прозу друкаваную на яго старонках у 2009 годзе, Літаратурнай прэміяй прэзідэнта горада Беластока імя Веслава Казанэцкага за кнігу „Белы конь" (2011), за кнігу „Поўня" другой прэміяй імя Ежы Гедройца (Мінск, 2019) і літаратурнай прэміяй „Гліняны Вялес" (Полацк, 2020).

якраз тады, як уся краіна і ўвесь наш усходнееўрапейскі рэгіён, перажывала вялікія палітычныя і эканамічныя змены.

— Прыйшоў да нас капіталізм, якога амаль ніхто з жывых ужо тут не помніў, — успамінае аўтар, — а разам з ім вялікія спадзяванні, якія, як то ў жыцці, паступова пераходзілі ў расчараванні. Аказалася, што ў капіталізме не ўсе будуць капіталістамі. Больш трэба, як у кожнай сістэме, звычайных рабочых, настаўнікаў, чыноўнікаў, але не настолькі многа, каб усім хапіла працы. І з'явілася нечуванае: працу трэба шанаваць! Няма ўжо так, што *czy się stoi, czy się leży, coś tam się należy*. Вось у такі час прыйшлося жыць маім героям.

— Героі Міхала Андрасюка любяць марыць, — канстатуе Марцін Рэмбач, — а вядома, што ў такіх людзей заўсёды заўважаецца пэўны дэфіцыт рэалізму. Таму ў сутыкненні з жыццём яны часта атрымліваюць розныя ўдары. Тым не менш, яны іх вытрымліваюць, перажываюць. У гэтым сэнсе кнігі Міхала — тэрапэўтычныя. Ён не толькі разумее сваіх герояў, але і любіць іх. І гэтая сімпатыя да людзей і месца — характэрная для прозы Міхала Андрасюка.

— Мне самому было цікава вярнуцца да таго, што я пісаў 20-30 гадоў таму, — кажа Міхал Андрасюк, — бо ж я цяпер зусім іншы чалавек ад таго, якім быў тады. І пішу інакш. Спачатку думаў перапісаць «Фірму» нанава, з улікам змен, якія адбыліся ў маім жыцці, але першнаперш у жыцці Мястэчка, каб, скажам, сённяшнія дваццацігодкі гэтыя тэксты зразумелі. Але хутка перадумаў і даў перакладчыку такія, як тады напісаліся. Калі моладзь гэтага не зразумее, то прынамсі будзе сведчанне таго бурлівага часу, які шмат у чым абнадзейваў, але і расчараваў.

Затое кніга не расчаруе нават самага пераборлівага чытача. І то не толькі зместам, але і формай. На фоне рознай выдавецкай бягучкі звяртаюць увагу сваёй эстэтыкай і дапрацаванасцю графічны і тыпаграфічны праект Юркі Асенніка і графіка на вокладцы Марка Атвіноўскага. Кнігу прыемна ўзяць у рукі і цікава ўвайсці ў свет беларуска-польскага Мястэчка на зломе XX стагоддзя.

**Мікола ВАЎРАНЮК**

**P.S.** Словы аўтара і перакладчыка прыводжу за праграмай «Беларускі тыдзень» на TVP 3 Беласток.

# Тэма «Грошы». Або як выкладаць тое, у чым ты сам не адмысловец



Тамара МАЦКЕВІЧ

**Тамара МАЦКЕВІЧ** — Таварыства беларускай школы, Менск.

## Ад аўтара

У мінулых артыкулах для «Беларускага настаўніка» я пісала, што мы разам з вучнямі на пачатку года вызначаем, якіх ведаў ім не хапае, каб быць паспяховымі і шчаслівымі. «Беларускі настаўнік» раней друкаваў сцэнарый заняткаў «Школа будучыні. Складаем навучальную праграму разам», які апісвае метады вызначэння важных для падлеткаў тэм. Звычайна падлеткам не хапае ведаў пра сябе, свой арганізм, як даць рады эмоцыям, як ладзіць з сябрамі, размаўляць нароўных з дарослымі, вырашаць канфлікты з нядобразычліўцамі. Дарэчы, сучасных падлеткаў гісторыя свайго роду, біяграфіі славутых і паспяховых беларусаў цікавяць не менш, чым штучны інтэлект, камп'ютарныя гульні ці бяспека ў сацыяльных сетках. Месца для такіх ведаў і трэніроўкі ўменняў супрацоўнічаць ды адстойваць свае прынцыпы трэба знаходзіць любому настаўніку, бо гэта ўсё цяпер называецца «скразнымі кампетэнцыямі» і павінна быць уключана ў выкладанне любога прадмета. Але сёлета мае вучні мне далі нялёгкую задачу: іх цікавіла як зарабіць шмат грошай. І грошы, як пазней высветлілася, ім патрэбныя не на тэлефоны апошняй маркі, не на моднае адзенне, а на адраджэнне Беларусі.

Тут нікуды не дзенешся! Скажу вам, што настаўніку, свядома абраўшаму неграшовую прафесію, прыйшлося нялёгка. Дзеці дапамагалі і літаратурай, і сваёй матывацыяй. У гэтым артыкуле прапаную Вам апісанне некалькіх заняткаў, дзе мы з вучнямі вучыліся разам, як зарабіць вялікія грошы (бо малыя нашу праблему не вырашаць). Час пакажа, ці будзе вынік.

**Сцэнарыі ўрокаў**

# Занятак 1. «Мары і мэты»

**Час:** 45 хвілін.

**Патрэбныя матэрыялы:** Сшыткі для запісу мэт і планаў, прэзентацыя (https://drive.google.com/file/d/16fKbIHTc0fyt9ZD5c_ncSoya2RfYdNOx/view).

**Мэты заняткаў:**

*Адукацыйная:* Дзеці будуць ведаць розніцу паміж паняццямі «мара» і «мэта». Змогуць правільна фармуляваць мэты, выбіраць рэсурсы, і планаваць дзеянні для іх дасягнення.

*Развіццёвая:* Спрыяць фармаванню ў вучняў здольнасці да планавання і самарэфлексіі.

*Выхаваўчая:* Выхоўваць адказнае стаўленне да будучыні і ўменне матываваць сябе на дасягненне жаданых вынікаў.

*Мэта для вучня:* Адкажу на пытанні: Як мары ператварыць у мэты? Якія ёсць стратэгіі для дасягнення мэт? Як пераадолець перашкоды і разлічыць рэсурсы?

**Ключавое пытанне:** Што важней, мары ці мэты?

**Ход заняткаў:**

1. **Актуалізацыя ведаў** (7 хвілін):

Настаўнік просіць перакласці на беларускую мову словы Dream, Goal, Objective, Purpose, Aim. Чаму ў англійскай мове так шмат слоў-сінонімаў для слова «мэта», і так мала для слова «мара»?

Абмеркаванне пытання: што такое мара? Як вы яе разумееце? Чым мара адрозніваецца ад мэты?

Настаўнік прапануе вучням прывесці прыклады сваіх мар і запісаць у сшытак.

Вучні вызначаюць розніцу паміж марамі і мэтамі праз кароткую дыскусію.

Мара — гэта жаданне або мроя, якая можа не мець дакладнага плана дасягнення.

Мэта — гэта выразна акрэсленае жаданне з планам дасягнення.

2. **Міні-лекцыя з заданнямі (гл. прэзентацыю)** (10 хвілін):

   - Тлумачэнне паняццяў «мэта», «план», «стратэгія», «рэсурсы».

   - Вучні крок за крокам ператвараюць мару ў мэту, выбіраюць рэсурсы і стратэгію яе дасягнення.

   Як ператварыць мары ў рэальныя мэты (падыход SMART: Specific, Measurable, Achievable, Relevant, Time-bound).

   Вучні запісваюць свае мэты і планы ў сшытак.

   **(Прэзентацыю або некаторыя слайды можна надрукаваць)**




3. **Рэфлексія** (5 хвілін):

   1. Абмеркаванне: Ці змянілася ваша ўспрыманне мар і мэт? Якія мэты ў вас зараз з'явіліся?

      Кожны вучань дзеліцца сваімі вынікамі практыкавання: ці ўдалося мару ператварыць у мэту, пабудаваць стратэгію для яе дасягнення, размежаваць рэсурсы?

   2. Пытанні да вучняў: як вы думаеце, чаму важна ставіць мэты ў жыцці?

   3. Падвядзенне вынікаў (3 хвіліны):

   Адказ на ключавое пытанне: Што важней, мары ці мэты?

**Сцэнарыі ўрокаў**

# Занятак 2. Мары і мэты на прыкладзе апавядання Змітрака Бядулі «Бондар»”

**Час:** 45 хвілін.

Патрэбныя матэрыялы: Аўдыязапіс апавядання Змітрака Бядулі «Бондар» (https://www.youtube.com/watch?v=vK7IHeLZkOA), сшыткі для запісу рэфлексіі і планавання.

**Мэты ўрока:**

*Адукацыйная:* Вучні праслухаюць апавяданне Змітрака Бядулі «Бондар», раскрыюць тэму мар і мэт праз аналіз галоўных герояў.

*Развіццёвая:* Развіць навыкі аналізу літаратурнага тэксту, фармаваць уменне вызначаць праблематыку і ідэю твора, супастаўляць літаратурныя падзеі з рэальным жыццём.

*Выхаваўчая:* Выхоўваць адказнасць за свой выбар, спрыяць развіццю маральных каштоўнасцей.

**Ключавое пытанне:** Ці праўда, што беларуская літаратура вучыць вырашаць беларускія праблемы? Як мары звязаны з жыццём чалавека?

**Ход заняткаў:**

1. **Актуалізацыя ведаў** (5 хвілін)**:**

   Увод у тэму ўрока. Растлумачце выраз: «Ператварайце мары ў мэты, але ніколі неператварайце мэты ў мары».

   Настаўнік прапануе пазнаёміцца з апавяданнем Змітрака Бядулі «Бондар» — пытанне да вучняў: пра што, на іх думку, можа быць гэтае апавяданне, зыходзячы з назвы?

   Настаўнік запытваецца пра незнаёмыя словы: бондар, цабэрак...

2. **Праслухоўванне апавядання** (20 хвілін)**:**

   **https://www.youtube.com/watch?v=vK7IHeLZkOA**

   Падчас праслухоўвання вучням трэба запісаць у сшытак мару і мэту галоўнага героя. Які ён выбраў шлях для яе дасягнення?

   Пытанні да вучняў пасля чытання:

   - Ці лёгка было Данілу дасягнуць сваёй мары? А ці залежала дасягненне мэты ад самога Данілы?

3. **Абмеркаванне** (10 хвілін):

**Аналіз героя:**

- Якая была мара ў Данілы?
- У якую мэту ён яе ператварыў і як яе дасягаў?
- Ці ён меў рэсурсы? Якія?
- Які крытэрый для дасягнення сваёй мары ён вызначыў?
- Якія якасці дапамаглі яму не здавацца на шляху дасягнення мары?
- Чаму Данілу не прынесла шчасця дасягненне мэты? Ці звязаная была мэта з марай?
- Мара павінна быць амбітная — вы згодныя? Як вы думаеце, якіх якасцей не хапіла Данілу, каб яго мара здзейснілася. (Самапавагі, здаровых амбіцый — ён не горшы чалавек за іншых. Даніла не звяртае ўвагі на блізкіх: на жонку, на суседзяў, для каго ён важны і хто для яго таксама важны).
- А ці была ўласная мара ў ягонай жонкі?
- Ці можна сказаць, што ў Данілы была добрая сям'я?
- Дадумайце і запішыце мэту, якую б мог паставіць сабе Даніла, калі б у гэтым апавяданні быў шчаслівы канец.
- Ці можна сказаць, што Даніла — тыповы беларус?

Вучні дзеляцца сваімі думкамі пра тое, ці можа мара стаць мэтай і што для гэтага трэба, каб не расчаравацца.

4. **Параўнанне з уласным жыццём** (8 хвілін):

Вучні запісваюць адну сваю мару і фармулююць крокі, як яе пераўтварыць у мэту, на прыкладзе гісторыі бондара.

5. **Рэфлексія і высновы** (6 хвілін):

**Пытанні для рэфлексіі:**

- Як мары і мэты ўплываюць на жыццё чалавека?
- Ці змянілася ваша стаўленне да ўласных мар пасля абмеркавання апавядання?
- Якія высновы можна зрабіць пра важнасць мець уласныя мэты і правільна іх вызначаць?
- Якія тыповыя якасці беларусаў перашкаджаюць ім дасягаць вялікіх вынікаў у бізнесе, палітыцы, фінансавай сферы? Ці прысутнічаюць яны ў героях апавядання? Ці падымае апавяданне агульнабеларускія праблемы?

Сцэнарыі ўрокаў

# Занятак 3. Інфляцыя дэфляцыя, банкаўская сістэма»

**Час:** 45 хвілін.

**Мэта:** Вучні будуць ведаць, што такое грошы і чаму яны важныя, механізмы павелічэння грашовай масы, будуць разумець паняцці інфляцыя, дэфляцыя, крэдыт, дэпазіт?

**Ключавое пытанне**: Ці праўда, што грошы правяць светам?

**Ход заняткаў:**

1. **Актуалізацыя ведаў** (5 хвілін):

   Дыдактычная задача: актывізаваць слоўнікавы запас дзяцей, праверыць узровень валодання спецыфічнай лексікай, дыягностыка ведаў па тэме.

   Настаўнік просіць вучняў па чарзе дабудаваць сказ, дадаючы адно слова па прыкладзе:

   - Падае снег.
   - На вуліцы падае снег.
   - На вуліцы ціха падае снег.
   - На вуліцы ціха падае пушысты снег.

   Сказы для дабудавання «***Грошы — гэта важна», «Усім патрэбныя грошы», «Грошы ўплываюць на эканоміку».***

2. **Міні-лекцыя настаўніка.**

   **Грошы: паняцце, функцыі і віды.**

   - Паняцце грошай: гісторыя іх узнікнення.
   - Асноўныя функцыі грошай (сродак абмену, мера каштоўнасці, сродак зберажэння).
   - Віды грошай: наяўныя, безнаяўныя, электронныя.
   - Абмеркаванне: Прыгадайце сітуацыі, калі вам даводзілася карыстацца электроннымі грашыма або наяўнымі. У чым розніца?

   **Інфляцыя і дэфляцыя.**

   - Паняцці інфляцыі і дэфляцыі: азначэнні і прычыны.
   - Наступствы інфляцыі для эканомікі і насельніцтва.
   - Дэфляцыя: прычыны і наступствы.

- Практычная задача: аналіз прыкладаў узроўню інфляцыі ў розных краінах.

**Банкаўская сістэма: Як памнажаецца грашовая маса?**

- Паняцце банкаўскай сістэмы і яе структура (Цэнтральны банк, камерцыйныя банкі).
- Асноўныя функцыі банкаў: крэдытаванне, дэпазіты, грашовыя пераводы.
- Роля Цэнтральнага банка ў рэгуляванні эканомікі.

Прыклады тлумачэння фінансавых тэрмінаў і працэсаў можна ўзяць з партала фінансавай пісьменнасці https://fingramota.by/be. Вось адзін з іх.




Як банкі ствараюць грошы?

Стварэнне грошай адбываецца таксама ў працэсе іх абарачэння, гэта значыць без непасрэднага ўдзелу цэнтральнага банка. Якім чынам? У выніку крэдытавання банкамі сваіх кліентаў. Глядзіце, як гэта адбываецца.

Каб лепш зразумець усё гэта, давайце разгледзім прыклад. У нас ёсць Пеця і Вася. У Пеці засталося 500 рублёў, і ён вырашыў пакласці іх у банк на дэпазіт. Праз пэўны час банк верне яму грошы з працэнтамі, напрыклад, 550 рублёў. Вася бярэ ў банку крэдыт у памеры 500 рублёў (гэта значыць тыя грошы, якія банк прыняў у заклад у Пеці). Вася павінен у вызначаны тэрмін вярнуць банку 600 рублёў (500 рублёў плюс працэнты). Цяпер высвятляецца — Пеця павінен банку 550 рублёў, а Вася — 600 рублёў.
І калі Вася на гэтыя грошы нешта купіць у краме, то крама пакладзе грошы ў банк, і банк зможа іх камусьці зноў пазычыць (і атрымаць працэнты) і гэтак далей. Вось так грошы робяць грошы, можна сказаць, што грошы памнажаюцца. Колькасць грошай расце, хаця фізічна іх ужо не выпускалі.

Як правіла, у перыяд эканамічнага росту колькасць грошай (так званая грашовая маса, агульная колькасць грошай у эканоміцы) у краіне расце, а ў перыяд спаду — змяншаецца.

5. **Заключная частка (15 хвілін).**

Дыскусія. Ці праўда, што грошы правяць светам?

*Заўвага: Важна, каб да правядзення такой дыскусіі вучні ўжо ведалі пра існаванне розных відаў рэсурсаў, валодалі асноўнымі эканамічнымі паняццямі, уяўлялі, як працуюць банкі або арганізацыі, ведалі пра лёсы заможных людзей. Напрыклад, падлеткі Віленскай нядзельнай школкі абмяркоўвалі Дональда Трампа, якому, як лічаць вучні, грошы не прынеслі шчасця ні ў асабістым жыцці (шмат жонак), ні ў грамадскім (у яго няма павагі грамадзян, нават калі яго абралі прэзідэнтам). У той час, як Віктар Амброс, бацька якога вырас сіратой на Смаргоншчыне, змог атрымаць добрую адукацыю (таксама важна) і атрымаў Нобелеўскую прэмію ў 2024 годзе. Дзеці не прыйшлі да адназначнага адказу на пытанне, але ўсе пагадзіліся, што шмат што залежыць ад мэт і каштоўнасцей, якія падзяляюць людзі. Але грошы — вельмі важны, але не адзіны рэсурс.*

# Занятак 4. «Што трэба, каб зарабіць шмат грошай?»



*(Заняткі праводзяцца ў форме трэнінгу.)*

**Час:** 45 хвілін.

**Патрэбныя матэрыялы:** каляровая папера, канверты або аднаразовыя кубачкі, слайды або раздрукоўкі з якасцямі прадпрымальніка.

**Мэта:** Вучні будуць ведаць, якія якасці трэба мець чалавеку, каб стаць паспяховым прадпрымальнікам. Прааналізуюць свае моцныя і слабыя бакі.

**Ход заняткаў:**

1. **Актуалізацыя ведаў** (8 хвілін):

   Настаўнік просіць вучняў падумаць, што б яны зрабілі для сябе, калі б мелі шмат грошай. А для іншых? Для краіны? Для свету?

   Вучні абмяркоўваюць пытанні ў парах.

2. **Якасці паспяховага прадпрымальніка.**

   Настаўнік знаёміць вучняў са зместам слайдаў. Вучні выпісваюць свае моцныя бакі (якасці, веды, якія яны маюць).

**Тэксты для слайдаў з якасцямі добрага прадпрымальніка.**

***Веды:***

- веды пра эканоміку, фінансы і сацыяльна-эканамічныя магчымасці, а таксама праблемы, якія могуць з'яўляцца ў працаўніка, арганізацыі ці грамадства;
- веды пра падыходы да планавання і кіравання праектамі, у тым ліку пра неабходныя рэсурсы;
- веды аб нормах і этычных праблемах, звязаных з бізнесам;
- разуменне, як прадпрымальнікі могуць стварыць пазітыўныя змены, напрыклад, з дапамогай справядлівага гандлю або сацыяльнага прадпрымальніцтва.

***Уменні:***

- планаваць і арганізоўваць вырашэнне праблем, дэлегаванне задач іншым;
- ацэньваць і вызначаць свае моцныя і слабыя бакі, а таксама ацэньваць рызыкі і прымаць іх, калі яны апраўданыя;
- аналізаваць і прымаць рашэнні;
- ператвараць ідэі ў дзеянні;
- весці перамовы, спраўляцца з сумневамі, неадназначнымі сітуацыямі і рызыкамі;
- у выпадку патрэбы заснаваць уласнае бізнес-прадпрыемства і кіраваць ім.

***Што яшчэ?***

- ініцыятыўнасць, адданасць справе;
- смеласць і настойлівасць у дасягненні мэт;
- жаданне матываваць іншых і паважаць іх ідэі, суперажываць і клапаціцца пра іншых людзей;
- пачуццё адказнасці за ўласны поспех на рынку працы;
- клопат пра навакольнае асяроддзе, этычныя нормы на працягу ўсяго працэсу прадпрымальніцкай дзейнасці.

3. **Інтэрактыўная гульня «Гандаль».**

**Ход гульні:** Удзельнікі сядаюць у кола. Настаўнік у сярэдзіну кола выстаўляе загадзя падрыхтаваныя пластыкавыя кубачкі. Кубачкі маюць наклейкі ў выглядзе трох розных фігурак (напрыклад, квадрат, трыкутнік і круг). У кожным з кубкаў розная колькасць нарэзаных каляровых паперак — грошай. Зялёныя — вартасцю 50 адзінак, чырвоныя — 20, сінія — 10. Але ў кубках з аднолькавымі фігуркамі аднолькавыя сумы грошай (пра гэта не гаворыцца). Настаўнік прапануе выбраць кожнаму сабе кубак, і пераклеіць наклейку з фігуркай сабе на адзенне, як бэджык.

На вялікі аркуш паперы ці дошку запісваюцца імёны гульцоў і іх адзнакі (фігуркі на бэджах).

Табліца

| Імя | Пачатковы капітал | 1 тур | 2 тур | 3 тур | Прыбытак |
|---|---|---|---|---|---|
| Антон | 250 | $X_1$ | $X_2$ | $X_3$ | |
| Ліза | 350 | $Y_1$ | | | |
| Ніна | 450 | $Z_1$ | | | |

Настаўнік прапануе кожнаму палічыць свае грошы, але нікому пра гэта не гаварыць. Затым настаўнік тлумачыць умовы гульні. Мэта гульні — быць першым, г.зн. назбіраць як мага больш грошай. Для гэтага кожны гулец можа заціснуць у кулак любую суму грошай і падысці да іншага з прапановай — «гандаль».

Другі гулец таксама заціскае ў кулак грошы, пасля чаго кулакі расціскаюцца. Перамагае той, у каго на далоні сума грошай аказалася большай. Ён забірае і тыя грошы, што былі ў саперніка ў кулаку. Гульня пачынаецца і перапыняецца па камандзе настаўніка і мае адно правіла: нельга адмаўляцца ад гандлю. Усё астатняе — дазволена. Пра гэтае правіла настаўнік нагадвае некалькі разоў.

Гандаль доўжыцца 5 хвілін. Настаўнік перапыняе гульню і прапануе палічыць грошы. Вынікі запісваюцца на вялікім аркушы паперы. Настаўнік тлумачыць, што па камандзе пачнецца другі этап. Мэта яго — атрымаць грошы. Але мяняюцца ўмовы: грошы можна зарабляць, выпрошваць, браць у крэдыт і г.д. Забарона застаецца адна — нельга адмаўляцца ад гандлю. Гульня доўжыцца яшчэ 5 хвілін. Пасля гульцы зноў вяртаюцца ў кола, і настаўнік абвяшчае, што праз 5 хвілін будзе трэці этап гульні, але правілы будуць выпрацаваны толькі адной камандай — «квадратамі». Удзельнікі з бэджамі ў выглядзе квадратаў для выпрацоўкі новых правілаў маюць 5 хвілін і сыходзяць у іншае памяшканне.

Пасля вяртання, адбываецца заключны этап гульні паводле новых правілаў.

- *Заўвага. Правілы гульні на 3-м этапе могуць выпрацоўваць гульцы, у якіх не засталося грошай, або «самыя багатыя». Рэкамендуецца гульню праводзіць некалькі разоў з рознымі спосабамі выпрацоўкі правілаў 3-га этапу.*

4. **Абмеркаванне** (10 хвілін):

   Пытанні пасля сканчэння гульні (могуць мяняцца ў залежнасці ад мэты, дзеля якой праводзіцца гульня):

- Як вы сябе адчуваеце? (адказваюць усе гульцы па чарзе)
- Што вам дапамагала, што перашкаджала дасягнуць мэты?
- Што можна было зрабіць інакш?
- Ці мелі вы стратэгію?
- Якія думкі ў вас узніклі?
- У якім этапе правілы былі больш справядлівымі? Чаму?
- Як гэта стасуецца да жыцця?
- Якія моцныя бакі вы ў сабе адкрылі? Над якімі якасцямі трэба папрацаваць?

**Ад чаго залежыць даход?**

(Хто згодны — падымае вялікі палец уверх, хто не — уніз.)

- Ад пачатковага капіталу?
- Ад умення пралічваць рызыкі?
- Ад умення рызыкаваць?
- Ад творчага падыходу?
- Ад умення лічыць?

**Якія ўменні і рысы характару трэба мець чалавеку, каб мець вялікі даход (быць паспяховым на рынку працы)?**

Адказы вучні абгрунтоўваюць, прыводзяць прыклады з уласных паводзін падчас гульні.

- Уменне дамаўляцца ці быць нахабным?
- Канкурэнцыя ці супрацоўніцтва?
- Гнуткасць ці настойлівасць?
- Жаданне памяняць правілы ці законапаслухмянасць?
- Уменне вучыцца ці ўменне развучвацца?

# Занятак 5. «Канкурэнцыя ці супрацоўніцтва»



*(Заняткі праводзяцца ў форме трэнінгу.)*

**Час:** 45 хвілін.

**Патрэбныя матэрыялы:** сырыя яйкі, трубачкі для кактэйляў, скотч, слайды або раздрукоўкі з якасцямі прадпрымальніка (гл. папярэдні план заняткаў).

**Мэта:** Вучні будуць ведаць, якія якасці трэба мець чалавеку, каб стаць паспяховым прадпрымальнікам, адчуюць розніцу паміж супрацоўніцтвам і канкурэнцыяй і зробяць высновы. Прааналізуюць свае моцныя і слабыя бакі,

**Ход заняткаў:**

**Актуалізацыя ведаў:**

Настаўнік звяртае ўвагу вучняў на **якасці паспяховага прадпрымальніка.**

Потым прапануе абмеркаваць у парах, што лепш працуе ў бізнесе — канкурэнцыя ці супрацоўніцтва.

Вучні абмяркоўваюць пытанні ў парах.

Настаўнік прапануе атрымаць адказ на гэтае пытанне на практыцы.

1. **Практыкаванне «Мазгавы штурм».**

   Вучні аб'ядноўваюцца ў каманды па 5-8 чалавек. Кожная каманда за 5 хвілін павінна правесці мазгавы штурм: вызначыць і запісаць як мага больш спосабаў, як можна выкарыстаць шклянку. Пасля заканчэння па чарзе кожная каманда называе адзін спосаб выкарыстання шклянкі. Выйграе тая каманда, якая назаве апошні варыянт.

2. **Практыкаванне «Яйка».**

   Вучні дзеляцца на каманды па 5-8 чалавек. Кожная каманда будзе мець яйка. Яно сырое. І аднолькавыя рэсурсы: скотч і трубачкі для кактэйляў. Заданне для каманд: абдумаць, спланаваць і зрабіць разам такую канструкцыю, каб яйка можна было скінуць з вышыні 1 метра на падлогу і яно засталося цэлым.

   Час на працу — 15 хвілін.





**Абмеркаванне.**

Пытанні-фанты. Вучні па чарзе выцягваюць пытанне, агучваюць яго і называюць імя, хто на яго павінен адказаць.

*Дадатак (пытанні для фантаў):*

- Ці табе спадабалася практыкаванне?
- Назаві эмоцыі, якія ты адчуваў (адчувала) падчас практыкавання?
- Распавядзі, чым асабіста ты займаўся падчас працы над канструкцыяй?
- Што табе не спадабалася? Што ты зрабіў бы па-іншаму?
- Ці былі ідэі, якія вы адкінулі і чаму?
- Як вы прымалі рашэнні?
- Ці былі ў камандзе людзі, якія не ўдзельнічалі ў працэсе?
- Ці ты задаволены вынікам сваёй каманды?
- Ці ты задаволены сваім унёскам у агульную справу?
- Якая была твая роля: лідар, арганізатар, аналітык, спонсар, будаўнік, памочнік, назіральнік збоку, лайдак, крытык, эксперт, кантралёр, шпіён, ахоўнік, быў у групе падтрымкі...?
- Хто быў лідарам у вашай камандзе?
- Хто не ўдзельнічаў у агульнай працы каманды і чаму?
- Ці табе лёгка было працаваць у групе?
- Ці ты б лепш справіўся з заданнем адзін (адна)?
- Хто з каманды паказаў падчас працы свае добрыя якасці. Якія?
- Мне было цікава даведацца, што...
- Які этап працы быў самым важным?
- Каму я б хацеў падзякаваць у сваёй камандзе? За што?

**Падсумаванне.**

Агульныя пытанні для ўсіх:

Навошта мы рабілі гэта практыкаванне? Якая можа быць ад яго карысць? Калі каманда супрацоўнікаў вырашае агульную бізнес-задачу, то якія якасці ім патрэбныя?

# Занятак 6. Канкурэнцыя і супрацоўніцтва. Трэнінг «Не разбіць яйка»



**Трэнінг «Вучымся супрацоўнічаць».**

Інавацыйныя праекты для ўзмацнення і развіцця настаўніцкай супольнасці ў Беларусі.

1. **Практыкаванне размінка «Мазгавы штурм».**

Працуем у трох камандах.

Кожная каманда за 5 хвілін павінна правесці мазгавы штурм: вызначыць і запісаць як мага больш функцый, якія можа выконваць шклянка. (Для чаго можна выкарыстаць шклянку).

Пасля заканчэння па чарзе кожная каманда называе адзін спосаб выкарыстання шклянкі. Выйграе той, хто назаве апошні варыянт.

2. **Практыкаванне «Яйка».**

Зараз мы падзелімся на трв каманды, кожная каманда будзе мець яйка. Яно сырое. І аднолькавыя рэсурсы (папера, скотч і трубачкі для яктэйляў. Ваша задача — абдумаць, спланаваць і зрабіць разам такую канструкцыю, каб яйка можна было скінуць з вышыні 1 метра на падлогу і яно засталося цэлым.

Час на працу — 15 хвілін.

3. **Аналіз — пытанні-фанты. (гл. дадатак)**

Потым агульнае пытанне — навошта мы рабілі гэта практыкаванне. Якая можа быць ад яго карысць? (мазгавы штурм)

*Дадатак (пытанні для фантаў):*

Ці табе спадабалася практыкаванне?

Назаві эмоцыі, якія ты адчуваў (адчувала) падчас практыкавання?

Распавядзі, чым асабіста ты займаўся падчас працы над канструкцыяй?

Што табе не спадабалася? Што ты зрабіў бы па-іншаму?

Ці былі ідэі, якія вы адкінулі і чаму?

Як вы прымалі рашэнні?

Ці былі ў камандзе людзі, якія не ўдзельнічалі ў працэсе?

Ці ты задаволены вынікам сваёй каманды?

Ці ты задаволены сваім унёскам у агульную справу?

Якая была твая роля: лідар, арганізатар, аналітык, спонсар, будаўнік, памочнік, назіральнік збоку, лайдак, крытык, эксперт, кантралёр, шпіён, ахоўнік, быў у групе падтрымкі...?

Хто быў лідарам у вашай камандзе?

Хто не ўдзельнічаў у агульнай працы каманды і чаму?

Ці табе лёгка было працаваць у групе?

Ці ты б лепш справіўся з заданнем адзін (адна)?

Хто з каманды паказаў падчас працы свае добрыя якасці? Якія?

Мне было цікава даведацца, што...

Які этап працы быў самым важным?

Каму я б хацеў падзякаваць у сваёй камандзе? За што?

# Свята Дзяды ў беларускай традыцыі. Складаем радавод

**Сцэнарыі ўрокаў**

**Мэта:**

Вучні даведаюцца больш пра традыцыю святкавання Дзядоў у Беларусі, зразумеюць важнасць захавання сямейных традыцый і сувязей паміж пакаленнямі, складуць уласны радавод і звяжуць лёсы продкаў з гісторыяй краіны.

Занятак садзейнічае фармаванню нацыянальнай самасвядомасці, адказнасці, павагі да культурных традыцый.

**Задачы:**

1. Абмеркаваць традыцыі і абрады, звязаныя з Дзядамі.
2. Развіваць уменне аналізаваць культурныя з'явы і рабіць высновы.
3. Садзейнічаць самавызначэнню вучняў праз вывучэнне нацыянальнай спадчыны.
4. Сфарміраваць веды пра радавод і генеалагічнае дрэва.
5. Пазнаёміць з асноўнымі правіламі складання генеалагічнага дрэва.
6. Развіць навыкі даследчай працы і інфармацыйныя кампетэнцыі.
7. Стварыць праект у выглядзе генеалагічнага дрэва сваёй сям'і.

**Абсталяванне:**

- Прэзентацыя або відэа аб святкаванні Дзядоў[1].
- Прэзентацыя з прыкладамі генеалагічных дрэў.
- Ілюстрацыі, выявы і фотаздымкі, звязаныя з абрадамі на Дзяды.
- Шаблоны для складання генеалагічнага дрэва.
- Папера, алоўкі, фламастары.

1 https://drive.google.com/file/d/18CCouZjm_ty3UhqIZKuwVKZNgVQ49cRn/view [доступ: 05.12.2024].

**Ход урока:**

1. **Уводзіны ў тэму** (5 хвілін).

   - Франтальнае апытанне: ці вы ведаеце штосьці пра сваіх продкаў, якіх вы не бачылі? Як вы пра іх даведаліся? А што вы ведаеце пра нацыянальных герояў Беларусі? Чым яны знакамітыя? Вучні дзеляцца сваімі думкамі і ведамі пра памяць продкаў.

   **Ключавое пытанне:** Пра каго больш важна ведаць: пра сваіх продкаў, ці пра нацыянальных герояў?

2. **Гісторыя святкавання Дзядоў** (10 хвілін).

   - Гутарка аб тым, як беларусы шануюць памяць продкаў.

   - Кароткі расказ пра гісторыю і значэнне свята Дзяды:

     » Дзяды як дзень памінання продкаў, яго карані і значэнне ў беларускай традыцыі.
     » Аповед пра духоўную сувязь жывых з памерлымі продкамі.

   - Абрады і традыцыі, звязаныя са святкаваннем Дзядоў:

     » Збор сям'і, застолле ў гонар памерлых, памінальная свечка, наведванне магіл.
     » Выкананне спецыяльных абрадаў, звароты да продкаў, словы падзякі.

   - Новы сэнс свята пасля 1987 года.

   - Што такое радавод? Прынцыпы складання радаводаў.

   - Разгляд паняцця «генеалогія» і «генеалагічнае дрэва»:

     » генеалагічнае дрэва — гэта графічнае адлюстраванне сямейных сувязей, якое дапамагае наглядна ўявіць пакаленні сям'і і зразумець іх сувязь паміж сабой.
     » генеалагічнае дрэва — гэта не проста схема, а таксама сімвал сямейнай гісторыі і культуры.

   - Тыпы генеалагічных дрэў:

     » **Простае генеалагічнае дрэва** — змяшчае толькі асноўную інфармацыю: імёны і даты нараджэння членаў сям'і.
     » **Пашыранае генеалагічнае дрэва** — уключае дадатковыя звесткі: месцы нараджэння, прафесіі, важныя падзеі жыцця.
     » **Творчае генеалагічнае дрэва** — афармляецца індывідуальна, выкарыстоўваючы малюнкі, сімвалы, каларытныя выявы, і можа выглядаць як сапраўднае дрэва з галінамі або схема з лініямі сувязей.

- Радавод Радзівілаў і іншых знакамітых людзей.

3. **Практычная праца** (15-20 хвілін):

    - Раздаць шаблоны генеалагічных дрэў.

    - Кожны вучань пачынае запаўняць шаблон сваімі данымі і данымі сваіх продкаў. (Навучэнцы, якія не маюць поўнай інфармацыі, могуць зрабіць агульны план і дадаць прапушчаныя даныя дома.)

    - Варыянт 1: Падзяліць вучняў на групы ці пары і папрасіць іх распавесці пра сваю сям'ю групе.

    - Варыянт 2: (для старэйшай школы): Навучэнцы адкрываюць у браўзеры сваіх смартфонаў «Адкрыты спіс» https://by.openlist.wiki/ (можна таксама выкарыстоўваць базу рэсурсаў «Мемарыял» https://base.memo.ru/ і «Віртуальны музей савецкіх рэпрэсій у Беларусі» https://represii.net/repressed). Настаўнік прапануе правесці пошук па сваім прозвішчы і прозвішчах сваіх продкаў. Інфармацыю пра знойдзенага чалавека з такім прозвішчам вучань заносіць на сцікер пэўнага колеру і прымацоўвае каля пэўнай даты на стужцы часу на дошцы. Усе сцікеры размяшчаюцца на стужцы часу на дошцы.

4. **Рэфлексія і аналіз** (5-7 хвілін):

    - Абмеркаванне: «*Што новага вы даведаліся пра сваю сям'ю пры складанні радавода? А пра сябе? Як адлюстраваліся гістарычныя падзеі на лёсе вашых родных?*»

    - Як складанне генеалагічнага дрэва можа дапамагчы лепш зразумець свае карані, гісторыю краіны і сямейныя каштоўнасці?

    - Чаму мы павінны памятаць пра лёсы продкаў, якія загінулі падчас рэпрэсій, войнаў, масавых забойстваў?

    - Адказ-развага на ключавое пытанне: Пра каго больш важна ведаць: пра сваіх продкаў, ці пра нацыянальных герояў?

5. **Дамашняе заданне (на выбар):**

    - Запытацца ў бацькоў, бабуль і дапоўніць свае радаводы.

    - Запісаць кароткую сямейную гісторыю або ўспаміны, звязаныя са сваімі продкамі.

**Чаканыя вынікі:**

Па завяршэнні ўрока вучні павінны мець асноўнае ўяўленне пра тое, чаму людзі ўшаноўваюць памяць продкаў і складаюць радаводы, разумець прынцыпы складання генеалагічнага дрэва і ўмець стварыць свой уласны радавод. Вучні ўсвядомяць, як гісторыя краіны цесна звязана з гісторыямі іх сем'яў.

**Рэкамендацыі:**

Для вучняў, якія маюць цікавасць да гэтай тэмы, можна прапанаваць дадатковую літаратуру або сайты з больш глыбокай інфармацыяй пра генеалогію.

**Спасылка на прэзентацыю:**
https://drive.google.com/file/d/18CCouZjm_ty3UhqlZKuwVKZNgVQ49cRn/view

**Раздатка 1.** Шаблон «Мой радавод»





# ДЗЯДЫ: СВЯТА ПАМІНАННЯ ПРОДКАЎ У БЕЛАРУСКАЙ КУЛЬТУРЫ



## ПАХОДЖАННЕ СВЯТА

Дзяды звязаны з **паганскімі** вераваннямі і абрадамі, якія адзначаюць пераход душаў памерлых у іншы свет.

**Што такое валатоўкі?**

## СІМВОЛІКА СВЯТА

Дзяды сімвалізуюць **памяць** і **сувязь** паміж жывымі і памерлымі.

З 1987 года святкаванне Дзядоў перайшло ў публічную прастору. Упершыню правялі Дзяды ў парку Янкі Купалы ў Мінску грамадскія аб'яднанні **«Тутэйшыя» і «Талака»** ў 1987 годзе. А 30 кастрычніка 1988 года ў Мінску ля Усходніх могілакі Курапат адбыліся шматтысячнае шэсце і мітынг-рэквіем памяці ахвяр сталінізму.









## ЗАКЛЮЧЭННЕ

Свята Дзяды — гэта не проста абрад, а глыбокая **культурная** з'ява, якая ўмацоўвае сувязь паміж пакаленнямі. Яно нагадвае нам пра важнасць памяці пра продкаў і значэнне **супольнасці** ў нашым жыцці.

**Старонкі для пошуку:**

«Адкрыты спіс» https://by.openlist.wiki

База рэсурсаў «Мемарыял» https://base.memo.ru

«Віртуальны музей савецкіх рэпрэсій у Беларусі» https://represii.net/repressed

# Адукацыйныя прапановы Фонду «Тутака»

Словы «Хто ты гэткі...» Янкі Купалы, якія пару гадоў таму прыпомніў на вялікай рок-сцэне Сяргей Міхалок з гуртом «Ляпіс Трубяцкой», сталі загалоўкам серыі праграм на You Tube канале Фонду «Тутака». Кожны запіс можна выкарыстаць ці на ўроку беларускай мовы, ці гісторыі і культуры беларускай меншасці ў Польшчы, ці проста на гісторыі або грамадазнаўстве.

**Першы сезон быў прысвечаны традыцыйнай культуры. Расказвалі пра яе Кацярына Ваданосава, Аліна Дэмбоўская, Ірына Мазюк і Артур Гавел. Вось спасылкі на іх расповеды. Паглядзіце, можа якраз нешта падыдзе да вашых урокаў.**

Беларускія абрады:

https://www.youtube.com/watch?v=XXysrx56r4s

Падляшскі абрадавы ручнік:

https://www.youtube.com/watch?v=J-6dPkfGdGs

Падляшская драўляная архітэктура:

https://www.youtube.com/watch?v=Ys2R-gXNtC0

Беларускія традыцыйныя рамёствы:

https://www.youtube.com/watch?v=HespY7lqJR4&t=7s

**Другі сезон склалі гістарычныя лекцыі пра беларусаў Падляшша. Чытаюць іх: Анэта Прымака-Онішк, Анатоль Вап, Славамір Іванюк, Алег Латышонак, Антон Мірановіч, Яўген Мірановіч. Лекцыі ўкладзеныя храналагічна, ад пачатку XV стагоддзя да нашых дзён.**

У Рэчы Паспалітай Абодвух Народаў:

https://www.youtube.com/watch?v=SU8QKlH-g48&t=11s

Доўгае XIX стагоддзе:

https://www.youtube.com/watch?v=QGdYFLg5JH4&t=1s

Ад вайны да вайны:

https://www.youtube.com/watch?v=U5oCT9pAjgc&t=20s

У Польскай Народнай Рэспубліцы:

https://www.youtube.com/watch?v=yb80nfVCLIY&t=27s

У III Рэчы Паспалітай:

https://www.youtube.com/watch?v=xALLhEGMbaw

**На трэці сезон цыкла «Хто ты гэткі...» складаюцца рэпартажы пра сучаснае жыццё беларусаў Падляшша. Тэмы паасобных серый: традыцыйная культура, традыцыя як інспірацыя для сучаснага мастацтва, школьніцтва, арганізацыі і сродкі масавай інфармацыі. На момант складання «Беларускага настаўніка» былі даступныя гэтыя праграмы (астатнія таксама неўзабаве будуць на You Tube канале Фонду «Тутака»).**

Традыцыя:

https://www.youtube.com/watch?v=fEWfyN2Roys&t=39s

Культурны драйв на базе традыцыі:

https://www.youtube.com/watch?v=n_mXj7l_SII

* * *

Яшчэ хочам заахвоціць вас прыняць удзел у IV Міжнародным дэкламатарскім конкурсе да Дня роднае мовы.

Як удзельнічаць?

Выберыце свой любімы верш або частку празаічнага твора.

Здыміце відэа чытання і дасылайце яго разам з анкетай праз гэтую форму: https://docs.google.com/.../1FAIpQLSfZ4GpzOfimMY.../viewform

Тэрмін падачы заявак: да 31 студзеня 2025 года.

Будзьце гатовы да фіналу 21 лютага 2025 года ў Тэатры лялек (Беласток) або анлайн!

Калі сёлета не паспееце, нічога страшнага. Усё паказвае, што Фонд будзе працягваць гэтую высакародную ідэю і ў будучыні. Для вашых вучняў можа гэта быць непаўторны шанц праверыць свае магчымасці перад прафесійнымі акторамі і прызнанымі паэтамі. Не толькі прадэкламаваць твор, але і пагаварыць, параіцца. І гэта можа быць больш важным, чым узнагарода.

**(ак)**

У Дэкламатарскі КОНКУРС да Дня роднай мовы

# КОНКУРС З НАГОДЫ ДНЯ РОДНАЙ МОВЫ

# Змест

**Карэктура:** Віталь Луба
**Тэхнічны рэдактар:** Адам Паўлоўскі
**Рэдактар:** Мікола Ваўранюк

**Выдавец:** Аб'яднанне ў карысць дзяцей і моладзі, якія вывучаюць беларускую мову АБ-БА

**Друк:** Koncept Białystok

**Zrealizowano dzięki dotacji Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji**

**Publikacja wyraża jedynie poglądy autora/ów i nie może być utożsamiana z oficjalnym stanowiskiem Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.**

**Публікацыя выражае толькі меркаванні аўтара(аў) і не можа атаясамлівацца з афіцыйнай пазіцыяй Міністра Унутраных Спраў і Адміністрацыі.**

**Мікола Ваўранюк**
Ад рэдактара — **5**

**Вера Краўчук**
Настаўніца роднай мовы — **7**

**Мікола Ваўранюк**
Час надзеі і расчараванняў... — **21**

**Тамара Мацкевіч**
Тэма «Грошы». Або як выкладаць тое, у чым ты сам не адмысловец — **25**

**Тамара Мацкевіч**
Свята Дзяды ў беларускай традыцыі. Складаем радавод — **41**

**(ак)**
Адукацыйныя прапановы фонду «Тутака» — **47**